*Юлія Пракоф'ева*

## САКРАЛЬНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ЛАНДШАФТУ ЯК АБ'ЕКТ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Вывучэнне і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага этнасу – надзвычай актуальная праблема айчыннай этналогіі, цесна звязаная з неабходнасцю выяўлення рэгіянальных і лакальных форм бытавання этнакультурнай традыцыі. Аднак, калі традыцыйны абрадавы фальклор і народныя рамёствы разглядаюцца як найбольш яскравыя праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, то традыцыі культавага ўшанавання элементаў ландшафту ў гэтай якасці практычна не фігуруюць. Нематэрыяльная культурная спадчына перадаецца з пакалення ў пакаленне, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцю, пры гэтым фарміруе пачуццё самабытнасці і пераемнасці. Ахова ўключае меры па забяспечэнні жыццядзейнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаючы яе ідэнтыфікацыю, дакументаванне, даследаванне, захаванне, абарону, папулярызацыю, перадачу, а таксама адраджэнне разнастайных яе аспектаў [4, с. 3].

Фармалізацыя паняцця «культурны ландшафт як аб'ект сусветнай спадчыны» адбылася на 16-й Сесіі Камітэта па Сусветнай спадчыне ў 1992 г. Паводле тыпалогіі ЮНЭСКА, усе культурныя ландшафты падзяляюцца на тры асноўныя катэгорыі: 1) антрапагенныя, мэтанакіравана створаныя чалавекам – «рукатворныя»; 2) ландшафты, якія сфарміраваліся натуральным шляхам, або эвалюцыяніравалі, сярод якіх вылучаюцца субкатэгорыі: рэліктавыя або «выкапнёвыя» ландшафты і ландшафты, якія працягваюць эвалюцыяніраваць; 3) асацыятыўныя ландшафты [2, с. 7].

Да асацыятыўнага можна аднесці ландшафт, які валодае культурнай каштоўнасцю, а таксама засвоены ландшафт, у якім характар засваення мае другаснае значэнне, а першаснае – сувязь з гістарычнымі падзеямі, асобамі, мастацкімі творамі. У асацыятыўных ландшафтах культурны складнік часта прадстаўлены не ў матэрыяльнай, а ў ментальнай форме, паводле асацыяцыі прыроднага аб'екта з якім-небудзь феноменам культуры [6, с. 58]. Такім чынам, прыродныя комплексы ўключаюцца ў гісторыка-культурную прастору без змены іх прыроднай рытмікі і эвалюцыі, часта апасродкавана, у якасці памятных месцаў, месцаў творчасці, сакральных (гэта значыць святых, культавых, рытуальных) локусаў і г.д.

Для вызначэння сакральных элементаў ландшафту Беларускага Падзвіння, як аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, можна карыстацца крытэрыямі прыроднай і культурнай каштоўнасці нематэрыяльнай спадчыны, распрацаванымі ЮНЭСКА. Паводле іх, аб'ект павінен валодаць наступнымі фундаментальнымі ўласцівасцямі: а) аўтэнтычнасць і цэласнасць, б) наяўнасць асаблівай асацыятыўнай каштоўнасці (сакральнасці) в) унікальнасць прыроднага і культурнага феномену г) універсальная значнасць аб'екта прызнаецца не толькі сучасным грамадствам, але і разглядаецца ім як неабходная ўмова для жыцця будучых пакаленняў [6, с. 42]. Традыцыі шанавання элементаў ландшафту падтрымліваюць высокую біялагічную разнастайнасць і ахоўваюць ад дэградацыі прыроднае асяроддзе.

Асабліва варта адзначыць праблемы ў выяўленні і вызначэнні аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Толькі пры наяўнасці моцнай прыхільнасці да сакральнага локуса або ўстойлівых традыцый шанавання, агульных рэлігійных і патрыятычных пачуццяў членаў супольнасці можна вызначыць, зразумець і ацаніць сакральны локус як аб'ект спадчыны.

Афіцыйныя спісы культурных ландшафтаў перыядычна публікуюцца ў інфармацыйных бюлетэнях Цэнтра Сусветнай спадчыны і на адпаведных старонках Інтэрнэту. Унясенне аб'екта ў такі спіс сведчыць пра афіцыйнае прызнанне за ім статуса культурнага ландшафту. Першы сакральны комплекс, афіцыйна аднесены да культурнага ландшафту, быў вылучаны ў Новай Зеландыі ў 1993 г., затым гэты статус атрымалі сакральныя аб'екты ў Ліване (1998 г.), Польшчы (1999 г.), на Мадагаскары (2001 г.). Сакральныя ландшафты ўяўляюць сабою святыя месцы і рэлігійныя цэнтры розных канфесій [6, с. 151].

У 1992 г. выходзіць з друку брашура «Парады для горных ахоўных тэрыторый». Камісія Міжнароднага саюзу аховы прыроды ў ёй падкрэслівае, што многія горныя тэрыторыі маюць метафізічнае значэнне як святыя тэрыторыі, аб'екты страху, цырымоній і містыкі [7].

На Украіне ў 1990-я гг. былі даследаваны і ўзяты пад ахову крыніцы, гаі, асобныя дрэвы, курганы, гарадзішчы. Вучоныя выявілі, што найбольш шануюцца мясцовай супольнасцю так званыя «святыя» крыніцы і мемарыяльныя дрэвы [1]. У расійскім Кеназерскім нацыянальным парку даследчыкі вывучалі святыя гаі з крыжамі (капліцамі). Адзначался, што на гэтых участках традыцыйна было забаронена сячы дрэвы, ламаць галлё, нарыхтоўваць бярасту, весці любую гаспадарчую дзейнасць [8].

У міжнародным дэкларатыўным дакуменце «Добраахвотныя кіруючыя прынцыпы Агуэй-Гу» прапануюцца меры па абароне сакральных месцаў у выпадках рэалізацыі разнастайных праектаў у месцах размяшчэння святынь, а таксама на землях, якія выкарыстоўваюцца мясцовай супольнасцю. У гэтым дакуменце, нароўні з іншымі паняццямі, разглядаецца тэрмін «свяшчэннае месца», пад якім разумеецца «участак, аб'ект, структуру, вобласць або прыродную каштоўнасць, або раён, які прадстаўляе для нацыянальнага ўрада ці карэннай супольнасці асаблівую важнасць у адпаведнасці са звычаямі, мае важнае рэлігійнае і / або духоўнае значэнне» [3, с. 7].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

На пачатку XXI стагоддзя асабліва актуальнай з’яўляецца праблема захавання сакральных элементаў ландшафту Беларускага Падзвіння ва ўмовах дэпапуляцыі вёскі. Пытанні аховы сакральных локусаў падымаліся на многіх міжнародных мерапрыемствах, арганізаваных ЮНЭСКА: напрыклад, на канферэнцыі «Святыя (сакральныя) месцы, культурная і біялагічная разнастайнасць» (1998 г.), на Міжнародным сімпозіуму па важнасці святых (сакральных) месцаў для аховы біяразнастайнасці (2003 г.). Пры падтрымцы ЮНЭСКА, Сусветнай камісіі па ахоўных арэалах Сусветнага саюза аховы прыроды нацыянальнымі ўрадавымі і няўрадавымі арганізацыямі ў 1990-я гг. праводзіцца фіксацыя і навуковае апісанне сакральных локусаў, а таксама прымаюцца захады для іх юрыдычнай і практычнай аховы.

У выніку, вучоныя выявілі, што: святое месца з’яўляецца істотным элементам, які звязвае прыроду і чалавека, часта з’яўляецца падставаю культурнай самасвядомасці, можа быць эфектыўным сродкам захавання наваколля, калі яно ўладкавана ў мясцовую сістэму традыцыйнага светапогляду, традыцыйных вераванняў. Сакральныя элементы ландшафту маюць вялікую каштоўнасць для аховы прыроды як: арэалы з высокай біялагічнай разнастайнасцю, як запаведнікі для рэдкіх ці знікаючых відаў, як месцы, дзе захоўваецца прэсная вада, як узорныя месцы з высокай біяразнастайнасцю ў арэалах, якія падвергліся дэградацыі (важна для аднаўлення і рэабілітацыі дэградаваных экасістэм). Таксама выявілася, што з эканамічных прычын, напрыклад з неабходнасці апрацоўваць большыя зямельныя тэрыторыі пры росце насельніцтва і экстэнсіўнай гаспадарцы, ступень аховы святых (сакральных) мясцін мясцовымі грамадамі, і асабліва моладдзю, змяншаецца [9].

Сакральныя элементы культурнага ландшафту могуць захоўваць сваю прыналежнасць да аб’ектаў культурнай спадчыны толькі ў тым выпадку, калі дамінантная роля падчас іх захавання будзе належаць кансервацыі, рэстаўрацыі і прыстасаванню ў форме адаптацыі дзейнасці да сучасных тэндэнцый [5, с. 45].

Безумоўна, сакральныя элементы ландшафту, падлягаюць прававой ахове, падобнай з аховай інтэлектуальнай уласнасці. Такая ахова аказваецца неабходнай у якасці сродку, які дазваляе развіваць, забяспечваць пераемнасць традыцыі ўшанавання сярод носьбітамі і распаўсюджваць гэты від спадчыны як у рамках краіны, так і за мяжой. Для забеспячэння прававой аховы сакральных локусаў неабходна забяспечыць абарону носьбіта, ахоўваць інтарэсы збіральнікаў інфармацыі з тым, каб матэрыялы захоўваліся ў архівах у належным стане і паводле пэўных методык. Таксама патрабуецца прыняцце мер для абароны захаваных матэрыялаў ад супрацьпраўнага выкарыстання. Унікальнасць кожнага сакральнага элементу ландшафту мяркуе індывідуальны падыход да пытанняў захавання і выкарыстання, кансервацыі і музеефікацыі.

У якасці інструмента захавання, асэнсавання і асваення наведвальнікамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны на сенняшні дзень прызнаны культурны турызм – разнавіднасць актыўнага адпачынку, падарожжа з мэтай задавальнення духоўных патрэбаў, якое ўключае далучэнне да культурных каштоўнасцяў і прыроды рэгіёну, краіны, адзін са спосабаў выкарыстання вольнага часу, які дазваляе спалучаць духоўнае ўзбагачэнне асобы з аднаўленнем фізічных сіл і аздараўленнем.

Такім чынам, сакральныя элементы ландшафту Беларускага Падзвіння прадстаўляюць сабой унікальную каштоўнасць і з’яўляюцца неад’емнай часткай культурнай спадчыны беларускага этнасу. Іх захаванне мае вялікае значэнне ў культуры і жыцці дзяржавы і грамадства. У народных уяўленнях аб сакральных элементах культурнага ландшафту ўвасоблены векавы досвед і традыцыі пакаленняў.

**Спіс літаратуры:**


1. Борейко, В.Е. Защита местных природно-исторических святынь / В.Е. Борейко, А.В. Подобайло, В.Ф. Руденко – Киев : Киевск. эколого-культ. центр, 2002. – 144 с.
2. Веденин, Ю.А. Культурный ландшафт как объект культурного и природного наследия / Ю.А. Веденин, М.Е. Кулешова // Изв. РАН. – Сер. геогр. наук, 2001. – № 1. – С. 7 – 14.
3. Добровольные руководящие принципы агуэй-гу проведения оценок культурных, экологических и социальных последствий предлагаемой реализации проектов в местах расположения святынь, а также на землях и в акваториях, занимаемых или используемых коренными и местными общинами [Электронный ресурс] / Конф-я сторон конвенции о биолог. разнообразии, Куала-Лумпур, 9 – 20 и 27 февраля 2004 г. – Режим доступа : http://www.raipon.org/russian_site/library/ipw/number14/cbd.pdf. – Дата доступа : 12.03.2012.
4. Международная конвенция ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия [Электронный ресурс]. – Париж, 17 октября 2003 г. – Режим доступа : http://unesdoc.unesco.org/images/0013/001325/132540r. pdf. – Дата доступа : 13.03.2012.
5. Кулешова, М.Е. Культурные ландшафты: общие представления, понятия, подходы к оценке / М.Е. Кулешова // Экологические проблемы сохранения исторического и культурного наследия. – М. : Высшая школа, 2000. – С. 37 –52.
6. Культурный ландшафт как объект наследия / под ред. Ю.А. Веденина, М.Е. Кулешовой. – М. : Институт наследия; СПб : Дм. Буланин, 2004. – 620 с.: ил.
7. Рекомендации для горных охраняемых территорий [Электронный ресурс] / Всемирное культурное и природное наследие : Документы, комментарии, списки объектов. – М. : НИИ Наследия, 1999. – Режим доступа : http://www.ecoethics.ru/b09/600.html. – Дата доступа : 18.03.2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Третьяков, С.В. Святые рощи и деревья Кенозерского национального парка [Электронный ресурс] / С.В. Третьяков, А.В. Козыкин, С.В. Коптев, В.П. Косарев. – Режим доступа : http://www.kenozerje.17-71.com/sntforests.htm. – Дата доступа : 22.03.2012.
9. Schaaf, T. UNESCO's Experience with the Protection of Sacred Natural Sites for Biodiversity Conservation / T. Schaaf // International workshop on the importance of sacred natural sites for biodiversity conservation, Kunming and Xishuangbanna Biosphere Reserve, China, 17–20 February 2003. – Paris : UNESCO, 2003. – P. 13 – 20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ